Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
24 КАСТРЫЧНІКА 2014 г. ПЯТНІЦА № 203 (27813) Кошт 1800 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**



**Замкі аднаўляюць... дзівакі**

СТАР. 4



**«На працу, як на свята!»**

СТАР. 5

*Восеньскія кірмашы — добрая магчымасць для гараджан назапасіць на зіму вітаміннай гародніны. Купляюць танную прадукцыю оптам — мяхамі і нашулкамі. Нічога, што цяжка: для гэтай важнай справы можна і сваю другую палавіну да дастаўкі падключыць.*

# Свая ноша — не цяжар



Фота Васіля ЗЯНЬКО.

ЛІЧБА ДНЯ

**53-ю пазіцыю**

*займае Беларусь па Індэксе чалавечага развіцця (ІЧР), які складае 0,786 бала. Наша краіна ўзначальвае спіс краін з высокім узроўнем чалавечага развіцця і, магчыма, у бліжэйшыя гады зможа ўвайсці ў спіс краін з вельмі высокім ІЧР. Паміж 2005 і 2013 гадамі значэнне ІЧР для Беларусі вырасла з 0,725 да 0,786 — на 8,4%. Варта адзначыць, што ІЧР Беларусі — вышэй за сярэдні для краін з высокім чалавечым развіццём (ён роўны 0,735 бала), а таксама вышэй за сярэдні для краін рэгіёна Еўропа і Цэнтральная Азія (0,738). Напрыклад, у гэтым рэгіёне Сербія і Азербайджан, краіны, з прыкладна роўным Беларусі насельніцтвам, займаюць у рэйтынгу адпаведна 78-ю і 76-ю пазіцыі. Даклад аб чалавечым развіцці — штогадовая публікацыя, якая прадстаўляецца ПРААН, пачынаючы з 1990 года.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.10.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10690,00 | ▲ |
| Еўра | 13520,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 258,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 827,08 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Жыллё

# НЕРЭАЛЬНЫЯ ЦЭНЫ

Эксперты сталічнага рынку арэнды прагназуюць істотнае зніжэнне цэн ужо ў першыя месяцы наступнага года

**У жніўні і верасні ў Мінску назіраўся павышаны попыт на арэнднае жыллё. Без ажыятажу, але за гэтыя месяцы большасць стандартнага і недарагога жылля была «вымыта» са сталічнага рынку. Спецыялісты чакалі чарговага папаўнення рэгістра прапановы ў кастрычніку. Чакалі менавіта бюджэтнае жыллё па мінімальных цэнах, аднак на практыцы ўсё адбылося крыху інакш. Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на бліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» паведаміла намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» Аксана ЛУКАШЭВІЧ.**

## БЮДЖЭТНЫХ КВАТЭР БОЛЬШ НЕ СТАЛА

Цяпер спакойная сітуацыя крыху змянілася, бо на арэндны рынак пачалі зноў звяртаць увагу маладыя спецыялісты, якія «зачапіліся» ў сталіцы, а ў другой палове кастрычніка назіраецца яшчэ і новая невялікая хваля студэнцкага ажыятажу. Гэта тыя маладыя кватаранты, якія пасля апекі бацькоў па малой радзіме на новым месцы не знайшлі агульнай мовы з гаспадарамі жылля або з суседзямі ў інтэрнатах. Заўважу, што сёння сустракаюцца і такія студэнты. Яны зноў трапілі на рынак арэнды прыватнага жылля, а там цэннікі «кусаюцца».

Што здарылася з рынкам? Незразумела. З аднаго боку, колькасць прапаноў у агульным каталогу даволі вялікая і новых варыянтаў становіцца ўсё больш. Але гэта не зусім тыя варыянты, якіх чакаюць рэальныя кліенты.

СТАР. 3

■ Надвор'е

# Сонечна і анамальна холадна

**Гэтымі днямі надвор'е на тэрыторыі Беларусі будзе фарміравацца пад уплывам арктычнага антыцыклону, цэнтр якога знаходзіцца над Валагодскай вобласцю Расіі, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму ў пятніцу ў нас захаваецца сухое і халоднае надвор'е. Максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 4 градусаў па паўднёвым захадзе да 2 марозу па паўночным усходзе краіны. Будзе гаспадарыць антыцыклон у Беларусі і ў выхадныя. Зноў малавоблачна і без ападкаў. У ноч на суботу і нядзелю тэмпературны фон складзе ад 2 да 10 марозу, а па ўсходзе краіны — да мінус 11-12 градусаў. Удзень у суботу чакаецца ад мінус 1 градуса да плюс 6. У нядзелю крыху пацяплее — да 2-9 цяпла.

У пачатку наступнага тыдня да нас завітае больш цёплае паветра з боку Заходняй Еўропы. Тэмпература стане павялічвацца. У ноч на панядзелак будзе яшчэ даволі марозна — ад мінус 10 градусаў на ўсходзе да 1 цяпла на захадзе краіны. Удзень прыгрэе да 3-10 цяпла. Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у сярэдзіне наступнага тыдня стане цяплей яшчэ на 2-4 градусы.

**Сяргей КУРКАЧ.**



# ЧЫТАЧ СЭРЦАМ ЧУЕ

## Сучаснік выбірае кнігі, якія здзіўляюць тэмай, героямі або становяцца лекамі ад суму

**Пра гэта ішла размова на сустрэчы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

«У чым прычына таго, што за мінулыя 20-30 гадоў так і не з'явіліся сучасныя «Вайна і мір», «Узнятая цаліна»? Гэта што, адсутнасць талентаў? Ці аб'ектыўныя ўмовы жыцця, калі кніга перастае быць галоўнай крыніцай інфармацыі?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што не варта звязваць перамены ў чытацкай свядомасці толькі з тэхналагічнай рэвалюцыяй. На яго думку, напружаны рытм жыцця зрабіў стаўленне да літаратуры прагматычным. «Наш сучаснік выбірае кнігі, якія здзіўляюць яго тэмай, героямі альбо становяцца лекамі ад суму. Сур'ёзная літаратура ператвараецца ў чытанне для інтэлектуалаў», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы прапанаваў пабудаваць размову вакол галоўных кампанентаў літаратурнай справы: чытач, кніга, пісьменнік. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ў зале сабраліся цікавыя, неардынарныя людзі, з якімі можна пагутарыць не толькі пра стан беларускай літаратуры, але і шырэй — аб духоўнасці, культуры, гістарычным выбары Беларусі.

«Вучоныя сцвярджаюць, што эканамічныя, палітычныя, ваенныя перавагі дзяржавы не ажыццяўляюцца самі па сабе. Яны заўсёды частка і вынік яе духоўнасці і культуры. Развіццё грамадства, жыццё нацыі магчымы толькі з апорай на вечную трыяду: навуку, адукацыю, культуру», — адзначыў кіраўнік дзяржавы, прапанаваўшы пагаварыць пра тое, якую ролю ў гэтым працэсе адыгрывае мастацкая літаратура.

«Хацелася б пачуць ваша меркаванне пра тое, як сёння захаваць і развіць літаратурныя традыцыі і пры гэтым не адштурхнуць асноўную масу чытацкай публікі. Ці магчыма прапанаваць сучаснаму чалавеку цікавую яму кнігу, а пісьменніку знайсці свайго чытача?» — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што не верыць у наступленне «змяркання літаратурнай эпохі ў Беларусі». «У жыцці нашага народа літаратура заўсёды была сродкам пазнання свету і выхавання асобы, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Нездарма паэзія і проза Купалы і Коласа, Багдановіча і Мележа, Караткевіча і Быкава з'яўляюцца крыніцай нацыянальнага гонару многіх пакаленняў беларусаў».

«Чаму найвышэйшая планка, паднятая нашымі вялікімі пісьменнікамі, не адпавядае сучаснаму стану літаратурнага працэсу? — звярнуўся Прэзідэнт да прысутных. — Можа быць, масцітым пісьменнікам перашкаджае інерцыя мыслення, а маладому пакаленню не хапае жыццёвай мудрасці, вопыту? Ці проста змяніўся час і наша літаратура развіваецца ў рэчышчы агульнасусветных тэндэнцый, страціўшы традыцыі нацыянальнай пісьменніцкай школы?»

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што літаратура заўсёды сілкавала ідэямі і сюжэтамі іншыя віды мастацтва, і пацікавіўся, як развіваецца гэта творчая садружнасць сёння. «Ці справядлівыя прэтэнзіі пісьменнікаў, што сучасныя кампазітары і рэжысёры адвярнуліся ад нацыянальнай літаратуры? Ці прычынай спаду цікавасці з'яўляецца недахоп годных кніг?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы.

Кажучы пра пісьменнікаў, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на адсутнасць вялікіх твораў, нягледзячы на тое што пісьменнікаў нішто не стрымлівае ў свабодзе творчасці.

Прэзідэнт нагадаў, што ў савецкі час у коле творчай інтэлігенцыі было прынята скардзіцца на ціск цэнзуры і закасцянеласць, коснасць сацрэалізму. «Аднак менавіта ў тыя гады літаратура здабыла высокі аўтарытэт. Яўген Еўтушэнка назваў пісьменнікаў людзьмі, у якіх «бродит гордый дух гражданства, кому уюта нет, покоя нет», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Праўда, я і цяпер, гледзячы нейкія фільмы і чытаючы тыя ці іншыя опусы вялікіх літаратараў, артыстаў і іншага люду з вашага цэха, са здзіўленнем выяўляю, што іх, бачыце, там прыціскалі ў савецкія часы, заціскалі, працаваць не давалі, — сказаў Прэзідэнт. — Але ўсе яны сталі народнымі, усе жылі выдатна тады. Таму я раблю скідку, што цяпер стала модна скардзіцца: «Ах, вось тады нас заціскалі, прыціскалі і гэтак далей». Ну, няхай будзе так».

«У нашы дні ніхто не дыктуе, пра што і як пісаць. Калі дыктуюць, то вы, калі ласка, скажыце, хто і што дыктуе. Сышлі ў мінулае цэнзура і дзяржманаполія на друкаванае слова. Калі не так, вы таксама мне пра гэта скажыце», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да пісьменнікаў.

«Аднак свабода не спарадзіла вялікай літаратуры, а прывяла да расколу пісьменніцкай супольнасці. Што гэта, тупік? Або ў вас ёсць надзея на адnаўленне адзінага творчага поля?» — адзначыў Прэзідэнт.

Пісьменнікі, якія выступілі на сустрэчы, распавялі аб хвалюючых іх праблемах. У прыватнасці, гаворка ішла пра сучасныя тэндэнцыі ў літаратуры і ў цэлым зніжэнні цікавасці да кнігі ў свеце, а не толькі ў Беларусі. І, на іх думку, сёння сфера літаратуры знаходзіцца не ў лепшым стане.

Адказваючы на пытанне, чаму так мала рэкламуюць айчынныя творы і аўтараў, Прэзідэнт зноў вярнуўся да тэмы высакаякасных мастацкіх прадуктаў. «Скажыце: што рэкламаваць? Дайце прадукцыю, якую можна рэкламаваць, і мы сродкі на гэта знойдзем», — адзначыў ён. Прэзідэнт запатрабаваў эфектыўнай аддачы ад сродкаў, якія выдзяляе дзяржава на падтрымку творчых працэсаў. У прыватнасці, ён звярнуў увагу на ўкладанне дзяржавай сродкаў у развіццё кінематаграфічнай галіны. «Аддачы ад гэтага мы пакуль не бачым. А гэта ж грошы народа», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Дзяржава чакае ад пісьменнікаў твораў, якія спрыялі б выхаванню грамадзян сваёй краіны і патрыятызму. І грошы тут не заўсёды адыгрываюць галоўную ролю. Самае важнае — гэта талент. На мерапрыемстве былі прыведзены прыклады таго, як часам далёкія ад мастацтва людзі без укладання вялікіх сродкаў ствараюць вельмі папулярныя творы.

Гутарка пра літаратуру паступова перацякла ў рэчышча гутаркі аб сферы адукацыі. Гаворка зайшла аб тым, якую літаратуру сёння прапаноўваюць чытаць дзецям у школе і ці дастаткова ў гэтым пераліку беларускіх аўтараў. Удзельнікі сустрэчы лічаць, што варта больш увагі звярнуць на папулярызацыю беларускай мовы як унутры краіны, так і за яе межамі. Прагучала таксама прапанова падумаць аб стварэнні нацыянальнай ВНУ, дзе выкладанне вялося б толькі на беларускай мове.

Было ўзнята пытанне і працы выдавецтваў, у сувязі з чым была выказана думка аб неабходнасці больш уважліва вывучаць чытацкі попыт, адпрацаваць прапановы па конкурсным падыходзе для выдання кніг з дзяржаўнай падтрымкай.

У развіццё гэтай тэмы Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў краіне не будуць працаваць выдавецтвы, дзейнасць якіх будзе супярэчыць нормам закона. «Дзяржава будзе дзейнічаць у рамках закона і маральных прынцыпаў грамадства, — сказаў Прэзідэнт. — Я заўсёды прашу дзяржаўных служачых быць сумленнымі і справядлівымі. І, калі нейкія пісьменнікі, выдавецтвы будуць супярэчыць гэтым прынцыпам, яны неадкладна будуць закрыты».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што цяпер у кіно, літаратуры занадта шмат тэм жорсткасці і гвалту, ад якіх большасць чытачоў і гледачоў стамілася. На яго думку, не хапае папулярных твораў, асабліва ў кіно і на тэлебачанні, у якіх распавядаецца аб звычайных чалавечых лёсах.

Удзельнікі сустрэчы выказалі таксама пажаданне, каб у краіне з'явіўся значны літаратурны конкурс. Прэзідэнт падтрымаў гэтую ідэю, адзначыўшы, што крытэрыі адбору і вызначэння пераможцаў павінны выпрацаваць самі пісьменнікі. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў правесці конкурс да заканчэння 2014 года і абяцаў наведаць яго фінальную частку, калі будуць падводзіцца вынікі.

У завяршэнне сустрэчы кіраўнік дзяржавы заўважыў, што засталіся незакранутымі яшчэ многія тэмы, і прапанаваў працягнуць размову пазней. Аляксандр Лукашэнка папрасіў вылучыць для наступнай сустрэчы тыя праблемы, якія магчыма вырашыць толькі на ўзроўні Прэзідэнта.

## Леанід АНФІМАЎ:

# «УТРЫМАНЦЫ ПАТРАБУЮЦЬ АД ДЗЯРЖАВЫ САЦЫЯЛЬНЫЯ ДАБРОТЫ, НІЧОГА НЕ ДАЮЧЫ ЎЗАМЕН»

***Такое меркаванне выказаў старшыня КДК Леанід Анфімаў, які правёў у Пастаўскім райвыканкаме прамую лінію і асабісты прыём грамадзян.***

«Слова ўтрыманец мае больш шырокі сэнс, чым той, які можна прачытаць у энцыклапедыі. Гэта не толькі чалавек, які сядзіць на плячах у іншага. Утрыманец сядзіць на шыі ў дзяржавы. Ён патрабуе ад дзяржавы ўсе сацыяльныя даброты, прадугледжаныя заканадаўствам для грамадзян. Але ў той жа час гэты чалавек толькі патрабуе, а сам нічога не дае ўзамен. Такі чалавек і ёсць утрыманец», — сказаў Леанід Анфімаў.

На прамой лініі, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА, людзі выказвалі заклапочанасць наконт спынення дзейнасці спіртзавода ў гарадскім пасёлку Лынтупы, прасілі пакінуць у гэтым населеным пункце запраўку, якую збіраюцца закрыць з-за стратнасці, і паскорыць тэрміны газіфікацыі прыватнага сектара. Акрамя таго, гучала праблема гандлёвага абслугоўвання. А начальнік аднаго з ДРБУ прапанаваў выкарыстоўваць грошы, што паступаюць у бюджэт ад спагнання дзяржпошліны за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху, не толькі на мадэрнізацыю і капітальны рамонт, але і на бягучы рамонт.

Пасля прамой лініі Леанід Анфімаў правёў у Паставах асабісты прыём грамадзян. Палавіна — па пытанні выплаты заробтнай платы ў ААТ «Маладзечналес». Людзі таксама прасілі дапамогі ў вырашэнні зямельных канфліктаў. Старшыня КДК даручыў разабрацца ў кожнай праблеме і даць грамадзянам вычарпальныя адказы, а прапановы ўзяць на заметку і абмеркаваць магчымасць іх прымянення.

## ■ Знешняя палітыка

# НАШЫ ПАРЛАМЕНТАРЫІ ПАЕДУЦЬ У КІЕЎ НАЗІРАЦЬ ЗА ВЫБАРАМІ

**У гэтую нядзелю ва Украіне пройдуць датэрміновыя выбары ў Вярхоўную Раду. Парламентарыі нашай краіны прымуць удзел у назіранні за імі ў складзе Парламенцкай асамблеі АБСЕ.**

— Як і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва, у першую чаргу мы жадаем, каб ва Украіне наступіў мір і спакой, бо гэта наша брацкая краіна, наша суседка, — адказваючы на пытанне, чаго чакаюць ад гэтых выбараў беларускія дэпутаты, заявіў **Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў**. — Натуральна, мы пераканаемся з-за таго, што сёння там адбываецца.

Назіральнікамі ад Нацыянальнага сходу ў Кіеў паедуць намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Валянцін Мілашэўскі і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Мікалай Казаравец.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

# «ЛЕПШУЮ Ў СВЕЦЕ МЕДЫЦЫНУ» МОЖНА ЭКСПАРТАВАЦЬ І ДА НАС

**З афіцыйным візітам нашу краіну наведала кубінская ўрадавая дэлегацыя. Партнёры з вострава Свабоды прыехалі, каб абмеркаваць з беларускімі калегамі дыверсіфікацыю ўзаемнага гандлю і прэзентаваць магчымасці пашырэння гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з Кубай.**

Дэлегацыю ўзначальвае першы намеснік міністра знешняга гандлю і замежных інвестыцый Рэспублікі Куба Антонія Луіс Карыкартэ Карона. Па інфармацыі прэсслужбы МЗС, падчас сустрэчы з намеснікам міністра замежных спраў Аляксандрам Гур'янавым бакі абмеркавалі супрацоўніцтва з Кубай у прамысловай, сельскагаспадарчай, медыцынскай і навукова-тэхнічнай сферах, намецілі асноўныя кірункі развіцця ўзаемадзеяння па ўсім спектры двухбаковых адносін.

Праграмай візіту дэлегацыі ў Беларусь прадугледжаны сустрэчы і перамовы ў міністэрствах прамысловасці, аховы здароўя, Банку развіцця Рэспублікі Беларусь, канцэрне «Белрэсурсы», а таксама наведванне Мінскага трактарнага завода і агракамбіната «Дзяржынскі».

Супрацоўніцтва з Кубай пачалося яшчэ ў савецкія гады і з тых часоў не спынялася. Там шмат беларускай тэхнікі, абстальявання, ёсць патрэба ў запасных частках да гэтага... Абедзве краіны зацікаўлены ў развіцці стасункаў у галіне медыцыны і фармакалогіі. На востраве Свабоды гэтая сфера, як вядома, развіта вельмі высока — нездарма ж кубінская медыцына лічыцца лепшай у свеце.

Нагадаем, у канцы мінулага месяца беларускі пасол у Гаване Уладзімір Астапенка з кіраўніцтвам холдынга «БіяКубаФарма» абмеркавалі практычнае выкананне міжурадавага пагаднення аб узаемным прызнанні рэгістрацыі лекавых сродкаў. Па выніках перамоў былі ўзгоднены канкрэтныя крокі для далейшага развіцця супрацоўніцтва ў галіне сумеснай вытворчасці і пастаўак лекавых сродкаў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ** ■

## ■ Факт

# ПА АДНЫМ СЦЭНАРЫІ З РОЗНЫМ ФІНАЛАМ

**Следчыя Рэчыцкага раённага і Гомельскага гарадскога аддзелаў Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь устанаўліваюць акалічнасці разбояў, здзейсненых у дзвюх кавярнях Гомельшчыны адным і тым жа зламыснікам.**

Як паведаміла афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта па Гомельскай вобласці Марыя Крываногава, устаноўлена, што 21 кастрычніка каля 19.00 наведвальнік прыдарожнай кавярні, размешчанай на тэрыторыі Рэчыцкага раёна каля аўтадарогі «мяжа Расійскай Федэрацыі — Гомель — Кобрын», пагражаючы жанчыне-бармену пісталетам, завалодаў грашовай выручкай у Br1,2 млн і пачкам цыгарэт. Пасля здзяйснення злачынства злодзей некаторы час хаваўся ў лесе, а потым на спадарожным аўтамабілі даехаў да Гомеля і прапанаваў знаёмаму сустрэцца ў кавярні. Каля гадзіны ночы, калі прыяцель зламысніка і іншыя наведвальнікі пакінулі піцейную ўстанову, грамадзянін паспрабаваў паўтарыць сцэнарый папярэдняга разбою. Аднак у гэтым выпадку супрацоўніца аказала нецярозаму наведвальніку актыўнае супраціўленне і націснула кнопку трывожнай сігналізацыі. Міліцыянеры Савецкага аддзела Дэпартамента аховы вельмі хутка прыехалі і затрымалі 37-гадовага раней неадназова асуджанага. Дарэчы, пры асабістым даглядзе ў яго былі выяўлены і канфіскаваны пнеўматычны пісталет. Злодзею прад'яўлена абвінавачванне ў разбоі. Правяраецца яго дачыненне да іншых супрацьпраўных дзеянняў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ** ■

**Калектыў супрацоўнікаў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» глыбока смуткуе з выпадку заўчаснай смерці рэдактара рэдакцыі часопіса «Нёман» СІТУХІ Уладзіміра Мікалаевіча і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыка.**

# НЕРЭАЛЬНЫЯ ЦЭНЫ



Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Так, цяпер магчыма адшукаць «слабенькае» жыллё за 320—350 долараў. Аднак гэта будзе старая і маленькая «хрушчоўка» з газавай калонкай у трох- ці чатырохпавярховых дамах. Арэнда стандартнай аднапакаёўкі ўжо ў дзевяціпавярховым доме будзе каштаваць каля 400 долараў. А цэннік крыху лепшай па якасці кватэры з пральнай машынай і адпаведнай мэбляй — нават вышэйшы. Разам з тым, рэальны попыт істотна адрозніваецца ад прапановы.

У агенцтва сёння хапае заказаў на аднапакаёвыя кватэры, якія кліенты жадаюць набываць па кошце ад 300 да 350 долараў. І гэта павінны быць па якасці такія кватэры, якія сёння прапануюцца на рынку за 400—420 долараў. Як бачым, несупадзенне інтарэсаў складае ўжо каля 100 долараў.

## ТАННЫХ ДВУХПАКАЁВАК АМАЛЬ НЯМА

«У сегменце двухпакаёвых кватэр сітуацыя яшчэ больш складаная. У нашым агенцтве самая танная двухпакаёўка прапануецца ў Бараўлянах. Там за адносна прасторную кватэру ў новабудоўлі з кухняй і канапай просяць 420 долараў. А вось у Мінску больш-менш стандартныя двухпакаёўкі маюць сярэдні цэннік ад 500 да 530 долараў. Гэта будзе не жыллё пасля еўрарамонту, а проста ахайная кватэра эканом-класа, звычайна з лінолеумам, патрыманай тэхнікай і айчыннай мэбляй», — сцвярджае Аксана Лукашэвіч.

**Аксана Лукашэвіч упэўнена, што ў сталіцы неабходна правесці стандартызацыю ўсіх відаў кватэр, якія здаюцца ў арэнду.**

Тут кватэраздатчыкі з патэнцыяльнымі кватарантамі таксама адзін аднаго «не разумеюць», бо кліенты заказваюць у агенцтвах падобныя кватэры па кошце ад 400 да 480 долараў. Таму рынак сёння ў большасці сваёй стаіць. Сямейныя маладыя пары прапанову за 500 долараў нават не разглядаюць як варыянт. А між іншым, цяпер самая вялікая колькасць прапановы па двухпакаёўках прыпадае менавіта на кватэры з цэннікам у межах 500-600 долараў. Часам у агенцтвах «усплываюць» якасныя кватэры і па 440-500 долараў, аднак сустракаюцца яны даволі рэдка. Амаль цалкам знікла цяпер тэндэнцыя, калі на рынку арэнды было шмат пустых кватэр, якія доўгі час не маглі адшукаць новых пакупнікоў. Частка такіх «вісякоў» была прададзена, а ў астатнія кватэры была набыта гаспадарамі мэбля. Таму танных і пустых кватэр цяпер на рынку адзінкі.

У другой палове кастрычніка істотна звузіўся рынак арэнды па шматпакаёвых кватэрах. Кліенты практычна не заказваюць такое жыллё, таму і колькасць прапановы ў агенцтвах мінімальная. Спецыялісты рынку арэнды працуюць па такім жыллі выключна пад заказ кропкавым метадам. Сярэдні цэннік трохпакаёвых кватэр складае ад 600 да 650 долараў.

## ПАДВОДНЫЯ КАМЯНІ САМАСТОЙНАГА ПОШУКУ

Яшчэ ў пачатку года наш эксперт адзначаў той факт, што галоўны канкурэнт для агенцтваў — інтэрнэт. Ішла гаворка аб тым, што ўсё меншая колькасць уладальнікаў свабоднага жылля звяртаецца па дапамогу ў спецыялізаваныя агенцтвы нерухомасці. Гаспадары такога жылля пачалі часцей шукаць кватарантаў самастойна праз уласныя аб'явы ў глабальнай сетцы. Магчыма, гэта звязана з нежаданнем уласнікаў плаціць падаткі дзяржаве. Патэнцыяльныя кватаранты таксама звузілі свой пошук здымнага жылля наведваннем спецыялізаваных сайтаў. Яны не хочуць плаціць грошы за паслугі агенцтвам.

**Патэнцыяльныя кватаранты таксама звузілі свой пошук здымнага жылля наведваннем спецыялізаваных сайтаў.**

Між іншым, менавіта цяпер у інтэрнэце ўсё часцей пачалі «круціцца» розныя махляры ад рынку арэнды. А вось адшукаць праз сетку прыватнай асобе сапраўды салідныга кватаранта стала амаль нерэальна. Таму ўласнікі свабодных метраў паралельна са сваім пошукам пачалі закідваць інфармацыю аб кватэры ў агенцтва нерухомасці або адразу ў некалькі падобных структур. Нічога добрага з гэтага не атрымліваецца. Цяпер з першага погляду здаецца, што здымных кватэр на рынку стала ў разы больш, а насамрэч рэальную колькасць такога жылля нават спецыялістам падлічыць складана. У гэтай сітуацыі салідныя агенцтвы нерухомасці пачалі адмаўляцца ад тых уласнікаў жылля, якія займаюцца яшчэ і самастойным пошукам кватарантаў.

Больш за тое, пры самастойным пошуку гаспадары жылля могуць трапіць у шэраг непрыемных сітуацый. Бывалі выпадкі, калі з кватэры знікалі дарагія бытавыя прыборы і мэбля. А ў агенцтвах прафесіяналы дасканала растлумачаць кліентам усе нюансы беларускай прыватнай арэнды.

## АБ АДЗІНЫМ СТАНДАРЦЕ І Ў ПРЫВАТНАЙ АРЭНДЗЕ

Аксана Лукашэвіч упэўнена, што ў сталіцы неабходна правесці стандартызацыю ўсіх відаў кватэр, якія здаюцца ў арэнду. Нагадаю, што такі стандарт па якасці жылых памяшканняў і адпаведным ёй кошце квадратнага метра ўжо распрацаваны Мінюстам па дзяржаўным жыллі камерцыйнага выкарыстання. Усім спажыўцам зразумела якім чынам складаецца канчатковы кошт арэнды кватэр у дзяржсектары. Мінск падзелены на планава-эканамічныя зоны, у якіх дзейнічаюць адпаведныя каэфіцыенты.

А ў сферы прыватнай арэнды кожны асобны ўласнік самастойна вызначае цэннік па сваёй кватэры. Ніякіх абмежаванняў тут сёння не існуе. Спадарыня Лукашэвіч упэўнена, што гэта не зусім правільна. Згодна з цывілізаванымі ўмовамі гульні на рынку і прынцыпам справядлівасці, спажывец арэнднага жылля нават прыватнага сектара павінен плаціць толькі тую суму, якая адпавядае якасці прапануемага жылля. Распрацаваны стандарт дазволіў бы патрабаваць ад уласнікаў кватэр выканання тых ці іншых абавязковых параметраў. А павелічэнне цэннікаў па арэндзе стала б магчыма толькі пасля паляпшэння якасці жылля.

З іншага боку, масавае ўжыванне падобнага стандарту дазволіць дакладна падлічыць колькасць тых кватэр, якія здаюцца за сур'ёзныя грошы. У гэтым выпадку нашым заканадаўствам прадугледжана ўжо зусім іншае падаткаабкладанне. А пакуль, на думку Аксаны Лукашэвіч, бюджэт горада губляе сур'ёзныя грошы па недаатрыманых падатках. Акрамя таго, у гэтым выпадку спажыўцы такой паслугі будуць дакладна ведаць прыкладны цэннік таго, ці іншага жылля. Памер арэнднай платы стане больш стабільным і прагназуемым.

## НОВАЯ ПАСЛУГА ДЛЯ ІНШАГАРОДНІХ

У Мінску існуе пэўная колькасць уласнікаў здымных кватэр, пастаяннае месца жыхарства якіх знаходзіцца за межамі горада ці нават краіны. У гэтым выпадку здаць кватэру робіцца крыху праблематычна, бо прагляд здымнага жылля патэнцыяльнымі кватарантамі займае пэўны час. Таму «ПАКАДАН» цяпер прапануе такім кліентам новую паслугу па комплексным абслугоўванні. Агенцтва складае дагавор з уласнікам жылля, робіцца вопіс маёмасці кватэры — і кліенту застаецца толькі чакаць. Цяпер ужо агент будзе паказваць гэтую кватэру патэнцыяльным кватарантам і дамаўляцца з імі. Толькі на апошнім этапе гаспадара кватэры выклікаюць непасрэдна для заключэння дагавора па арэндзе. «Фішка» тут у тым, што для ўласніка здымнай кватэры гэта паслуга агенцтва бясплатная. А верагоднасць здачы такой кватэры найбольш высокая.

**У агенцтва сёння хапае заказаў на аднапакаёвыя кватэры, якія кліенты жадаюць набываць па кошце ад 300 да 350 долараў.**

Для агенцтва падобны механізм таксама мае свае плюсы, бо пасля заключэння дагавора з уласнікам не трэба канкураваць з іншымі агенцтвамі, а ў выніку «ПАКАДАН» мае ўласны актыў эксклюзіўных кватэр.

## ПАТАННЕННЕ БУДЗЕ ІСТОТНЫМ

Аксана Лукашэвіч упэўнена, што ўжо ў лютым-сакавіку наступнага года будзе назірацца сур'ёзнае патанненне ўсіх відаў арэнднага жылля. Бюджэтныя аднапакаёвыя кватэры атрымаюць рэальны цэннік у межах каля 300 долараў. Гэта стане максімальнай сумай, якую большасць кватарантаў зможа плаціць за здымнае жыллё. Кошт двухпакаёвых стандартных кватэр знізіцца да 350-450 долараў у залежнасці ад плошчы кватэр. Прасторныя і якасныя кватэры з элітным дызайнам у цэнтры горада будуць прапаноўвацца па кошце ад 500 да 800 долараў. Павінна істотна патаннець і вельмі дарагое жыллё.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Сказана — зроблена

# ПАПЯРОВАЯ «МІСІЯ» ПЕДАГОГАЎ СПРАШЧАЕЦЦА?

**Міністрам адукацыі Сяргеем Маскевічам зацверджаны пералік дакументаў для асобных катэгорый педагагічных работнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Як падкрэслівацца ў лісце, накіраваным ва ўпраўленні адукацыі аблвыканкамаў і Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама, гэты дакумент зацвярджаўся з мэтай скарачэння дакументаабароту ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі і канкрэтызацыі пераліку дакументаў, якія ўтвараюцца ў дзейнасці асобных катэгорый педагагічных работнікаў у рамках выканання іх службовых абавязкаў.**

У прыватнасці, **для настаўнікаў** абавязковымі дакументамі для запаўнення з'яўляюцца класныя журнал, каляндарна-тэматычнае планаванне, паўрочнае планаванне і дзённікі навучэнцаў.

**Для выхавальнікаў —** журнал групы падоўжанага дня ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, каляндарна-тэматычнае планаванне на чвэрць, штодзённае планаванне, рэжым работы групы падоўжанага дня, зацверджаны кіраўніком установы агульнай сярэдняй адукацыі.

**Для настаўніка, які выконвае функцыі класнага кіраўніка, —** класны журнал, план ідэалагічнай і выхаваўчай работы класнага кіраўніка на чвэрць (паўгоддзе), сацыяльна-педагагічная характарыстыка класа (яна павінна падтрымлівацца ў актуальным стане на працягу года), дзённікі навучэнцаў і асабістая картка навучэнца.

**Для педагога-арганізатара —** план работы на чвэрць (паўгоддзе).

**Для кіраўнікоў фізічнага выхавання** ў гэты пералік увайшлі план фізкультурна-аздараўленчых і спартыўна-масавых мерапрыемстваў і палажэнне аб унутрышкольных спартыўных мерапрыемствах. **Для педагогаў дадатковай адукацыі —** журнал планавання і ўліку работы аб'яднання па інтарэсах і праграма аб'яднання па інтарэсах.

Самы аб'ёмны пералік абавязковай дакументацыі — у педагогаў-псіхолагаў, сацыяльных педагогаў і настаўнікаў-дэфектолагаў.

Нагадаем, што на пасяджэнні рабочай групы па комплексным аналізе сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь кіраўнік рабочай групы, віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Анатоль Тозік асобна спыніўся на праблеме вялікай колькасці папер, якія даводзіцца запаўняць педагогам. «Лічу, што мы маглі б неадкладна дэбюракратызаваць школу і забараніць умешвацца ў вучэбны працэс. Мы можам заканадаўча ўстанавіць мінімум дакументаў, якія павінен весці настаўнік, класны кіраўнік і адміністрацыя школы», — падкрэсліў Анатоль Тозік.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

# Хто тут беспрынцыповы?

**Адказ на пытанне «Што такое «ўзроставы» канфлікт?» ведае кожны трэці беларус. Праект РАБОТА.TUT.BY высветліў, што трэцяя частка апытаных была ўдзельнікам канфліктнай сітуацыі з калегамі з-за розніцы ва ўзросце.**

Як высвятляецца, у калектывах, дзе сярэдні ўзрост — за 40, канфлікты здараюцца часцей, чым у маладых, дзе сярэдні ўзрост — да 30. Больш за ўсё маладыя абураюцца прыдзіркамі «старэйшых» у свой адрас (34%), выкарыстаннем састарэлых методык узроставымі супрацоўнікамі (31%), некампетэнтнасцю, не звязанай з прафесіяй (напрыклад, няўменнем карыстацца офіснай тэхнікай) (16,5%). Разам з тым, яны цэняць старэйшае пакаленне за салідны вопыт, які можна пераймаць (50%), дасведчанасць і кампетэнтнасць (25%).

Работнікі старэйшага ўзросту адзначылі, што ім лёгка працаваць з моладдзю, таму што яна крэатыўная (26%), больш дасведчаная ў навейшай тэхніцы і прыёмах працы (19%), ініцыятыўная (16,5%), больш працаздольная (15%). Недалюбліваюць маладых калег за беспрынцыповасць (31%), імпульсіўнасць (22%), нізкую адказнасць (9%).

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Футбол

# Усё ніжэй

**Нацыянальная зборная па футболе ў рэйтынгу ФІФА апусцілася на 17 пазіцый і цяпер займае 106-е месца. За час, які прайшоў пасля складання папярэдняга рэйтынг-ліста ФІФА, зборная Беларусі правяла два афіцыйныя адборачныя матчы чэмпіянату Еўропы-2016, у якіх пацярпела хатнія паражэнні ад зборных Украіны (0:2) і Славакіі (1:3).**

Сапернікі беларусаў у групе С еўракваліфікацыі займаюць наступныя пазіцыі: 10 — Іспанія, 19 — Украіна, 24 — Славакія, 99 — Македонія, 126 — Люксембург. Наступны адборачны матч Еўра-2016 беларусы правядуць 15 лістапада ў гасцях у іспанцаў. Заключным акордам футбольнага года для каманды Беларусі стане таварыскі матч са зборнай Мексікі, які адбудзецца 18 лістапада ў Барысаве.

Дададзім, што самую нізкую пазіцыю ў рэйтынгу зборная Беларусі займала ў жніўні 1994-га — 142-е месца, калі зборнай кіраваў Міхаіл Вергіенка. А лепшая пазіцыя ў нашай каманды была пры Бернду Штанге: у лютым 2011-га беларусы размяшчаліся на 36-м радку.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

■


Фота БЕЛТА

■ Было б жаданне

# БУДЗЕМ ЗНОЎ ЖЫЦЬ У КРАІНЕ ЗАМКАЎ?

## Як супалі памкненні энтузіяста з сацыяльнай адказнасцю бізнесу



Валанцёры ўжо аднавілі адну вежу і сцяну, а цяпер узяліся за вежу з брамай.

**«Вы ж на цэлую гадзіну спазніліся — калі працаваць будзеце?» — такім пытаннем сустрэў нас гаспадар рэканструкцыі. Ён за гэтыя часы прызвычаіўся да таго, што мала хто застаецца абыякавым да яго справы і абавязкова хацеў даць шанц журналістам на тое, каб прычыніцца да вялікай справы. Шкада толькі, што не ўсе адгукнуліся на яго заклік... Большасць запрошаных — дзяўчаты. Зразумела, яны пабаяліся запэцкацца.**

### АТАМНАЯ ЗБРОЯ МІНУЛАГА

На пачатку 2000-х гадоў у мястэчку Любча Навагрудскага раёна знайшоўся энтузіяст Іван Пячынскі, які сабраў вакол сябе такіх жа неабыякавых людзей, як і сам. Любчанскі замак быў пабудаваны ў XVI стагоддзі, перабудаваны — у XIX, а зруйнаваны — у XX стагоддзі. Стыль замка ўнікальны — перапляценне готыкі і рэнесансу. У сярэдзіне XVII стагоддзя ўладальнікам быў таленавіты палкаводзец Януш Радзівіл. У XIX ст. замак перайшоў да прыбалтыйскіх дваран Фальц-Фейнаў.

Стан велічнага некалі будынка не мог не хваляваць Івана Пячынскага, таму быў створаны дабрачынны фонд «Любчанскі замак» і распачата аднаўленне гістарычнай пабудовы. З таго часу там штогод працуюць валанцёры. А ў 2009 годзе дапамагаць дабрачыннаму фонду стаў Прiорбанк.



Іван ПЯЧЫНСКІ.

«У нашай канцэпцыі прапісана аднаўленне (рэканструкцыя) замка. Таму мы хочам усё ж такі аднаўляць. Інакш як мы будзем называцца краінай замкаў, калі і паказаць амаль не маем чаго? У тыя часы замкі былі як атамная бомба сёння. І чым іх было больш, тым мацнейшай лічылася дзяржава. Рэшткі некаторых будынкаў цяпер проста развальваюцца. А сітуацыя дрэнная ведаеце чаму? — разважае дырэктар фонду. — Таму, што наша заканадаўства патрабуе класічнага падыходу: адразу трэба распрацаваць канцэпцыю, потым стварыць архітэктурны і будаўнічыя праекты, і толькі пасля гэтага можна займацца рэстаўрацыяй ці аднаўленнем. Мы не пайшлі гэтым шляхам. Мы разумелі, што нам ніхто ніколі не дасць столькі грошай. І вырашылі працаваць крокквава, па этапах».

### «ЧАГО СЮДЫ ПРЫЕХАЛІ?»

У Любчанскім замку адпрацавала ўжо болей за 1,5 тысячы валанцёраў. Бывала, што па 100 чалавек працавала адначасова. «Тых, хто прыязджае, пытаюся: «Чаго сюды прыехалі?» Яны адказваюць: «Дапамагаць». — «Ну тады заставайцеся, а калі не будзеце дапамагаць, то ад'язджайце». Напэўна, менавіта так і трэба рабіць. Проста таму, што ніхто не падумае дапамагчы да таго часу, пакуль не скажаш «дапамагай». Такія ўжо ў нас людзі. Хаця многія і без заклікаў прыходзяць. Мясцовыя ўлады таксама стараюцца дапамагчы, чым могуць.

Каля 15 тысяч чалавека-дзён адпрацавана на рэканструкцыі бескарыслівa. Спецыялістаў на працу запрашаюць толькі тады, калі ёсць нейкія спецыфічныя работы. «І працуем мы не па 8 гадзін, а па 10-12. Людзі, якія не ўмеюць нічога рабіць, тут сапраўдныя цуды стваралі. Марудна, але якасна. Шмат дапамагаюць турысты, якія сюды прыязджаюць. Калі трэба было падняць чарапіцу на Кутнюю вежу, адначасова сталі чалавек 40 (цэлы аўтобус) і туды паднялі 2 тоны чарапіцы».

### НЕ ПРАСІЦЕ ГРОШАЙ АДРАЗУ

«З самага пачатку, калі я загарэўся гэтай ідэяй, мяне лічылі дзіваком, бо зрабіць усё гэта было немагчыма, — распавядае Іван Пячынскі. — А вось калі мы патынкавалі Кутнюю вежу, то адразу да нас пачалі ставіцца з павагай. І я хачу сказаць тым, хто жадае займацца аднаўленнем нейкіх аб'ектаў: спачатку пакажыце сябе. А то ўсе чакаюць грошай, каб нешта зрабіць. Мне давялося пратрымацца 7 гадоў без фінансавання. Мы маем сёння канцэпцыю, якая зацверджана Міністэрствам культуры. Аднак не адразу яна з'явілася. На яе ў нас не было грошай. Чатыры гады таму прыехаў да нас тагачасны міністр культуры Павел Латушка. Прывез з сабою Сяргея Касцючэнку, старшыню праўлення Пріорбанка. І спачатку банк дапамог нам прафінансаваць распрацоўку канцэпцыі, якая каштавала 130 мільёнаў рублёў. Пасля стаў дапамагаць пастаянна».

**ХОДЗЯЦЬ ЧУТКІ**

***Існуе рамантычная гісторыя ўзнікнення назвы мястэчка. Калі Міндоўг перапраўляўся цераз Нёман, то ў гэтых мясцінах пазнаёміўся з прыгажуняй Мартай. У хуткім часе заканаханыя ажаніліся. Мястэчка атрымала назву ад таго, што тут нарадзілася каханне. Дарэчы, ёсць меркаванне, што менавіта ў Любчы адбылося і хрышчэнне Міндоўга.***

### НЕКАЛЬКІ ЦІКАВЫХ ФАКТАЎ

- Фальц-Фейны былі ў сваяцтве з Раманавымі. І гэтае месца яны выбралі невыпадкова, яго называлі лепшым ва ўсёй Мінскай губерні.
- Было выдаткавана 600 чалавека-дзён, каб выкапаць рэшткі трэцяй вежы. Паднялі больш за 500 «кубоў» зямлі.
- У тынковачныя аздабленні, як і патрабуе старая тэхналогія, пры рэстаўрацыі дабаўлялі бялкі яек.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, фота аўтара.**

*Навагрудскі раён*

■ Навіны аўтапрама

# МАЗ стварыў самы доўгі тралейбус у СНД

## Ад гэтай і трох іншых мадэляў чакаюць камерцыйнага поспеху

**На Мінскім аўтамабільным заводзе прэзентавалі 4 новыя мадэлі пасажырскай тэхнікі. Гэта аўтобус МАЗ 232 для прыгарадных перавозак, МАЗ 203965, які працуе на газавым паліве, высокатэхналагічны аўтобус МАЗ 203 (спецыяльна распрацаваны з улікам патрабаванняў маскоўскіх заказчыкаў), і тралейбус МАЗ 215т з пяццю дзвярыма. Машыны маюць сучасны салон і адпаведныя тэхнічныя характарыстыкі.**

### ДАРАГІ, АЛЕ ЭКАНОМНЫ

Па словах **Юрыя СЫРАКВАША, галоўнага канструктара па пасажырскай тэхніцы ААТ «МАЗ»**, новыя машыны без усялякіх сумненняў павінны прынесці камерцыйны поспех прадпрыемству. Бо кожная з іх зроблена згодна з усімі сучаснымі тэхналагічнымі патрабаваннямі. Так, напрыклад, МАЗ 203965, нягледзячы на высокую цану, у параўнанні са сваімі папярэднікамі будзе больш эканомным. «Кошт аднаго «куба» газу для новага газавага аўтобуса МАЗ, па дэкларараваных звестках «Газпрама», складзе не больш за 50% ад кошту аднаго літра дызельнага паліва. І пры эксплуатацыі мадэль будзе спажываць у суадносінах да дызельнай мадэлі на 1 літр дызельнага паліва — адзін «куб» газу», — паведаміў спецыяліст.



### ДЛЯ МАСКВЫ — БОЛЬШ КАМФОРТУ

«МАЗ 203 створаны па замове Масквы. У ім знаходзяцца рухавік «Еўра-5», каробка аўтамат, кандыцыянер, сістэма электроннага прывада тармазоў (сістэма, якая павышае не толькі бяспеку, але і дазваляе дасягнуць раўнамернага зносу ўсіх тармазных накладак). Таксама кіроўца можа бачыць на дысплеі знос дэталяў аўтобуса і загадзя ведаць, калі яму трэба звярнуцца па тэхабслугоўванне. Гэта скароціць час на дыягностыку», — прадстаўляе новы аўтобус Юрый Сыракваш. У 203-й мадэлі ўсталявана сістэма кантролю ціску і тэмпературы ў шынах. Ёсць высоўны трап для інвалідаў. Мадэрнізаваная сістэма падвескі забяспечвае плаўнасць хады. Зменшылася і колькасць пасажырскіх месцаў. Пры гэтым павялічылася адлегласць паміж сядзеннямі — для больш камфортнага праезду.

А міжгародні аўтобус МАЗ 232 створаны спецыяльна для перавозкі вялікіх груп людзей. Яго можна выкарыстоўваць як турыстычны, экскурсійны, ведамасны транспарт. Унутры ёсць магутная сістэма ацяплення, кандыцыянер. Мадэль адпавядае ўсім апошнім патрабаванням бяспекі, якія становяцца больш жорсткімі кожныя пяць гадоў.

І нарэшце тралейбус МАЗ 215Т самы вялікі ў СНД — яго даўжыня складае 18,75 метра. Наяўнасць пяці дзвярэй забяспечвае зручную пасадку і высадку пасажыраў. Каштуе такі тралейбус 4,5 млрд рублёў.

Самы доўгі тралейбус у СНД.



Фота Любові БЛЯЯВАЙ.

### КАНКУРЭНЦЫЯ ШТУРХАЕ НА НОВЫЯ РЫНКІ

«Цяпер 203-я мадэль рыхтуецца да ўдзелу ў маскоўскіх тэндарах. Там вельмі сур'ёзныя канкурэнты: «Вольва», «Мерседэс», «Сканія», расійскія вытворцы. Аднак з-за санкцый, якія ўводзіліся за гэты год, шмат што змянілася. Гэта дае нам прэферэнцыі. Бліжэйшыя канкурэнты для нас сёння — гэта Ліпецкі аўтобусны завод, аўтобусны завод «Валжанін», ПАЗ», — адзначыў Юрый Сыракваш. Тэхніка ўжо сёння практычна сертыфікавана, і цяпер вытворцы чакаюць аб'явы аб'ёмаў тэндараў, дзе будуць называцца ўжо канкрэтныя лічбы.

2013-ы быў нялростым для «МАЗа» з-за спаду продажаў на рынках Расіі, Украіны. Аднак, як адзначае **Віталь ГАНЧАРЫК, намеснік генеральнага дырэктара па знешнеэканамічных сувязях ААТ «МАЗ»**, прадпрыемству ўсё ж удалося пераарыентаваць кірунні экспарту на іншыя краіны СНД і далёкага замежжа. Гэта дазволіла павялічыць аб'ёмы продажаў на 20%. За 9 месяцаў рост экспарту ў натуральным выражэнні склаў 115% у адносінах да аналагічнага перыяду 2013 года. У 2 разы павялічыўся аб'ём продажаў на рынак арабскага рэгіёна. Адкрыліся рынкі Катара і Бахрэйна. У 2014 годзе «МАЗ» арганізаваў зборачную вытворчасць аўтобусаў у В'етнаме. Пастаўкі туды сёлета павялічыліся больш чым у 3 разы ў параўнанні з 2013-м. Ажыццяўляюцца пастаўкі ў Лаос і Камбоджу, а таксама больш за 100 адзінак пасажырскай тэхнікі — у Еўрасаюз і ў 16 краін Афрыкі.

Цікавы і той факт, што «МАЗ» сёлета павысіць цэны на экспарт тэхнікі ў Расію на 2%. Гэта звязана з павышэннем цэн «КАМАЗам».

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

# АМАТАР ТЭАТРА Ў ПРАМЫМ ЭФІРЫ

## РАДЫЁВЯДУЧЫ УЛАДЗІМІР ТРАПЯНОК ЛІЧЫЦЬ, ШТО ЖЫЦЦЁ ЦУДОЎНЫМ РОБІМ МЫ САМІ

**Уладзімір — чалавек з прыемным голасам у радыёэфіры і абаяльны аптыміст у жыцці. Відаць, падсвядомая мара і захапленне радыё, якое было ў яго жыцці з дзяцінства, прывялі яго на канал «Культура». Тут працуе вось ужо амаль 12 гадоў. Пэўны час запрашаў слухачоў на «Начныя спатканні», расказваў пра кіно ў праграме «Стоп-кадр» і знаёміў з радыётэатрам «Без мантажу». Паміж эфірамі мы даведаліся ва Уладзіміра, як выпрабоўваюць на радыё новыя кадры, дзе шукаць рамантыку ў руцінным жыцці і ці не страціла радыё сваёй магічнай сілы…**



**— Як атрымалася, што акцёр па адукацыі выбраў радыё замест сцэны?**

— Здаецца, недзе ў класе пятым ці шостым я супрацоўнічаў з нашым раённым радыё. У школе часта ўдзельнічаў у самадзейнасці. І людзі, якія былі побач, заўсёды казалі, што мне трэба ісці ў акцёры. А я рыхтаваўся да паступлення на журфак. Нават удзельнічаў у конкурсе сачыненняў газеты «Чырвоная змена», па ўмовах якога перамога давала права без іспытаў паступаць на журфак. Але так склалася, што вырашыў паступаць на Універсітэт культуры на акцёрскую спецыяльнасць.

Студэнтамі мы наведваліся ў будынак, дзе знаходзіўся Саюз тэатральных дзеячаў, бо падчас вучобы падпрацоўвалі ў спектаклях і сюды прыходзілі па ганарары. У адзін з прыходаў я ўбачыў па суседстве дом на Чырвонай, 4 і зразумеў, што гэта тое месца, якое я ведаю з дзяцінства. Таму што ў нас дома заўсёды гучала радыё. Прачынаўся пад пазыўныя «Радыёфакта», засынаў пад «Маладзёжнае радыё». Я ведаў, што радыё — гэта класна, творча, прафесійна і цікава. А на трэцім курсе я пачаў абзвоньваць усе рэдакцыі і трапіў на дырэктара «Культуры» Кацярыну Агееву, якая мне сказала: «Прыходзьце, паглядзім…»

**Радыётэатр застаецца па-ранейшаму актуальным. Традыцыі, закладзеныя 80 гадоў таму, — жывыя і сёння.**

**— Якімі былі першыя ўражанні?**

— Уся «кухня» — як перадачы рыхтуюцца, што там адбываецца — была для мяне таямніцай. Вельмі ўсяго баяўся. Мяне пазнаёмілі з тагачасным загадчыкам аддзела інфармацыі Святланай Колмак. Яна завяла мяне да сябе ў кабінет і пачала расказваць пра сутнасць справы. Потым мне даручылі зрабіць матэрыял з нейкай выставы ў музеі сучаснага выяўленчага мастацтва… Я прыйшоў на радыё як карэспандэнт службы інфармацыі ў сакавіку, а ў жніўні ўжо сеў каля мікрафона ў прамым эфіры.

Служба інфармацыі — гэта тое месца, дзе кожны, хто прыходзіць, сябе выпрабоўвае. І вось я пачаў чытаць навіны ў прамым эфіры, і літаральна праз месяц вёў ранішні эфір. Да сёння я гэта раблю, хоць ужо сам кірую службай інфармацыі, курырую праекты ранішняга эфіру.

**— Якую рэакцыю атрымліваеце ад аўдыторыі?**

— Калі браць прыемныя лісты, то хачу ўспомніць адзін са сваіх любімых праектаў «Начныя спатканні» — ён быў інтэрактыўным, выходзіў увечары. Я меў магчымасць размаўляць са сваімі слухачамі, рамантыкамі-паўночнікамі. І аднойчы на адрас радыё мне даслалі вялікі канверт… Аказалася, адзін слухач, які заўсёды вечарам настройваўся на «Культуру», стварыў сваю асацыяцыю з праграмай. Намаляваў карціну, дзе на даху сядзяць каты, ім свеціць месяц, і яны слухаюць радыё.

**— Ці шмат рамантыкі ў вашым жыцці?**

— Бывае. І тут справа не ва ўзросце, а ў стаўленні. Раней, калі ты пазнаеш нешта, адкрываеш для сябе новыя гарызонты, то табе становіцца цікава. І ўсё гэта выглядае вельмі рамантычна… А калі ты ўжо дарослы чалавек, прысутнічае нешта патаемнае, нязведанае, максімалісцкае ў поглядзе на жыццё.

У мяне былі моманты, калі разумеў, што праца стала руцінай. Кожны тыдзень паўтараецца адно і тое ж. Праз некалькі гадоў я паступіў у магістратуру, стаў вывучаць гісторыю мастацтваў і зноў пачаў адкрываць для сябе мноства цікавых рэчаў. І іх можна спасцігаць, нават нягледзячы на ўзрост. У мяне нават у гэтым сезоне з'явілася рубрыка, якая называецца «Жыццё цудоўнае». Гэта, у прынцыпе, тая рамантыка, пра якую вы пытаецеся. Яе сутнасць у тым, каб выходзіць за рамкі штодзённых праблем і адкрывацца жыццю.

**— Стамляецеся ад працы?**

— Памятаю, як у свайго выкладчыка сцэнічнай мовы Уладзіміра Рагаўцова — чалавека, які ўсё жыццё адпрацаваў на радыё,— я неяк запытаў, што рабіць, калі не адчуваеш радасці ад працы. Уладзімір Мітрафанавіч сказаў: «Знаходзячыся каля мікрафона, паспрабуй сказаць сабе, што «ідзеш на свята». І вось з такімі думкамі працуй».

**— Што чакае слухачоў у новым сезоне?**

— Я казаў, што ў мяне з'явілася новая рубрыка «Жыццё цудоўнае» па аўторках. Яна будуецца на ўспамінах людзей таленавітых, творчых. Мае суразмоўцы ўзгадваюць самыя цікавыя моманты, наноў іх перажываюць і дзеляцца настроем з тым, хто нас слухае. Радыё, дарэчы, мае магічную сілу: праз эмоцыі, праз настрой я магу зараджаць тысячы слухачоў. І рубрыка нацэлена на тое, каб людзі помнілі, што, напрыклад, дастаткова проста ўсміхнуцца сабе ў люстэрка, паслухаць любімую музыку — і адразу настрой узнімаецца.

